# «ДЛЯ МЯНЕ ЦЯГНІК — ЯК МОЙ РОДНЫ ДОМ...»

**...Да сына (ён у нас дацэнт, кандыдат навук, выкладае ў знакамітых МАІ і «Баўманцы») мы дабіраемся фірменным цягніком «Мінск — Масква». Гэта, па-першае, вельмі зручна, а па-другое, на вышыні там і ўзровень камфорту, і абслугоўванне.**



Час адпраўлення цягніка з Мінска ў 22.20, прыбыццё ў Маскву — 8.15. Вечар і цэлая ноч у дарозе, а гэта значыць, пасажыры могуць павячэраць і выпіць гарбаты, спакойна паспаць. Там для гэтага ўсе ўмовы: у купэ ўтульна і чыста, сервіраваны столік, ручнікі з узорамі васількоў...

Праваднiцы (у вагоне іх дзве) прапануюць напіткі, стравы для вячэры. Адмаўляцца неяк не выпадае яшчэ і таму, што дзяўчаты — сама прыгажосць: са шчырымі ўсмешкамі, у строгіх дзелавых касцюмах, пілотках, белых пальчатках... Адна з іх — Юлія Войцехаўна Жышко — нават зямлячка, з нашай Ашмяншчыны.

На чыгунцы Юля працуе больш чым дваццаць гадоў (з улікам двух дэкрэтных водпускаў). У яе, як і ва ўсіх праваднікоў гэтага поезда, самы высокі шосты разрад. Да таго, як трапіць на «фірму» — калегі так называюць гэты цягнік, — Юлі прыйшлося і павучыцца, і папрацаваць праваднiцай на іншых, звычайных — паездзіць у Прыбалтыку, ва Украіну. Гаспадыняй у вагоне элітнага цягніка Юля стала толькі два гады таму.

Як расказвала, патрабаванні да майстэрства тут высокія, ёсць яны і да знешнасці. Ад праваднiц патрабуюцца акуратнасць і натуральнасць: строгае адзенне, прычоска, няяркі макіяж. Манікюр дазваляецца, але пазногці павінны быць сярэдняй даўжыні, лак — натуральных адценняў... Іншымі словамі, усё накіравана на тое, каб не прыцягваць да сябе залішняй увагі пасажыраў.

«Працаваць на «фірме», — кажа Юлія Войцехаўна, — гэта найвышэйшы пілатаж у нашай справе! Гэта мара многіх праваднiц яшчэ з тых часоў, калі яны выбіралі прафесію. Яно і зразумела: тут іншыя ўмовы працы, іншая аплата, а сярод пасажыраў можна сустрэць столькі вядомых асоб!..»

Юля з прыемнасцю ўспамінае, што сярод яе пасажыраў былі вядомыя дзяржаўныя дзеячы, спявачка Лаліта, салісты груп «На-на», «Іванушкі Інтэрнэшнл», «Песняры». «І трэба сказаць, — адзначае зямлячка, — што яны не патрабавалі асаблівай увагі... А вось людзі пажылыя... З імі рознае здаралася: часам спынялі цягнік, выклікалі медыкаў, бо самі можам аказаць толькі першую дапамогу: прапанаваць лекі, зрабіць штучнае дыханне, апрацаваць нескладаныя раны».

За дзесяць гадзін, якія цягнік знаходзіцца ў дарозе, самім праваднікам на сон адводзіцца ўсяго некалькі і толькі глыбокай ноччу. Пры гэтым дзяжурны праваднік ёсць у кожным вагоне. Што да сапраўднага, паўнацэннага адпачынку, то ён прадугледжаны толькі пасля прыбыцця і прыборкі вагона, падрыхтоўкі яго да наступнага рэйса.

«Для мяне цягнік — як мой родны дом, — кажа Юлія. — Шэсць сутак адпрацавала — столькі ж адпачываю. Усё паспяваю зрабіць і з новымі сіламі...»

Не мог не спытацца, ці даводзілася пазбягаць залішняй увагі пасажыраў-мужчын, бо часам знешняя прывабнасць — не толькі перавага, але і рызыка.

«Усе канфліктныя сітуацыі трэба ўладжваць у момант іх узнікнення, — зазначае Юлія. — На крайні выпадак у службовым купэ ёсць прамая сувязь з начальнікам цягніка».

Прынцыпы бяспекі як пасажыраў, так і праваднікоў тут выконваюцца няўхільна.

**Мікалай Балыш,**
*г. Ашмяны.*